**Палулех, З.** Не сціхае боль Афганістана / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2005. — 3 авг. — С. 2.

# НЕ СЦІХАЕ БОЛЬ АФГАНІСТАНА



Болем, пакутамі і цяжкімі ўспамінамі закрануў Афганістан лёс Анатоля Шарака з Друі. І сёння, праз столькі гадоў, яму не даюць спакою нанесеныя той вайной душэўныя і фізічныя раны.

Восенню 1983 года юнак быў прызваны на тэрміновую службу ў армію. Высокі, здаровы і фізічна загартаваны, Анатоль тады і падумаць не мог, што трапіць у самае пекла ваенных падзей, якія разгортваліся ў далёкай краіне. Хаця пра вайну на афганскай зямлі ведаў, але, як прызнаўся сам, у маладосці ўсё гэта было пакрыта налётам рамантыкі, а пра смерць на кожным кроку нават і не думалася.

Напачатку была «вучэбка» ў Ашхабадзе. Малады салдат рыхтаваўся стаць вадзіцелем БМП. Дысцыплінаванага, адказнага і сумленнага юнака паважалі сябры ў роце, цанілі камандзіры.

І вось вучоба закончана.

...13 красавіка 100 салдат з часці, у іх ліку і Анатоль, былі накіраваны спецрэйсам на самалёце ў Кабул, аб чым даведаліся толькі, узняўшыся высока ў неба. Аднак з першай спробы да месца прызначэння дабрацца не ўдалося. Аэрадром афганскай сталіцы падвяргаўся абстрэлу. Самалёт рушыў назад у Ашхабад, а назаўтра раніцай – зноў у палёт.

Афганская зямля сустрэла 40-градуснай спякотай. Але гэта былі не самыя цяжкія выпрабаванні, якія чакалі воінаў-інтэрнацыяналістаў. На грузавым верталёце іх даставілі на месца дыслакацыі часці ў Джэлалабад. І пачаліся ваенныя будні.

...Анатолю вельмі балюча ўспамінаць тыя дні, ночы, месяцы. Гляджу на яго і бачу, як у дарослага, моцнага духам і загартаванага цяжкасцямі мужчыны міжволі коціцца па шчацэ сляза. Але ён скупымі, нешматслоўнымі фразамі працягваў расказваць, як напачатку суправаджаў калоны пад кулямётным агнём, а потым, калі служыў у разведцы, браў у палон «духаў». У час адной вельмі адказнай аперацыі група з шасці чалавек трапіла ў акружэнне, і ў ходзе бою чацвёра разведчыкаў, у тым ліку і Анатоль, былі цяжка паранены.

Здарылася гэта якраз 14 красавіка 1984-га, роўна праз год з пачатку службы А. Шарака ў Афгане. Затым было працяглае лячэнне ў Ленінградзе, інваліднасць. І як напамін аб усім гэтым – ордэн Чырвонай Зоркі, уручаны ўжо ў Браслаўскім райваенкамаце.

Аповяд даваўся майму субяседніку няпроста, і таму мы вырашылі перавесці гутарку на мірную тэму.

У сям'і Шаракаў растуць чацвёра дзяцей. Старэйшаму сыну Вадзіму ўжо васемнаццаць гадоў. Напачатку бацька вельмі баяўся, каб ягонаму першынцу не давялося паўтарыць бацькоўскі шлях, але, дзякуй Богу, цяпер нашы хлопцы не служаць у «гарачых» кропках. Радуюць бацькоў дочкі Віка, Каця і Рыта – добрыя памочніцы маме Эле.

У мінулым годзе сям'я справіла наваселле: жыллё пабудавалі за кошт выдзеленай дзяржавай бязвыплатнай субсідыі.

Каля дома шмат кветак, агарод. Дарэчы, гэта адна з найбольш добраўпарадкаваных і дагледжаных сядзіб у Друі.

Хочацца пажадаць Шаракам моцнага здароўя і шчаслівага жыцця, а асабіста Анатолю – мірных, спакойных сноў.

**З. Палулех**

***НА ЗДЫМКУ:*** *воін-інтэрнацыяналіст Анатоль Шарак з дзецьмі*

*Фота аўтара*